ПАДЗЕЯ

# ВІНШУЕМ З ПОСПЕХАМ ДРАМАТУРГА НІНУ РЫБІК І ЯЕ НАРОДНЫ ТЭАТР

**Шаноўныя сябры, вядомая беларуская журналістка і наша калега па СПБ, празаік, публіцыст, драматург Ніна Аляксееўна Рыбік (Астравец) паведамляе радасную навіну.**




Спектакль «Калядны вечар» па маёй п'есе ў пастаноўцы рэжысёра Вольгі Турубаравай атрымаў дыплом І ступені на абласным тэатральным фестывалі «Лідскія сустрэчы».

Увогуле ўдзел у гэтым фестывалі быў, па вялікім рахунку, авантурай. Пачнем з таго, што Астравецкі народны тэатр ніколі не прымаў удзел у «Лідскіх сустрэчах» – а праводзяцца яны раз у два гады, сёлетнія ў 13 раз. Першапачаткова на фестываль быў заяўлены спектакль «Святло ў канцы тунэля», але Ірына Чыж, якая выконвае ролю галоўнай гераіні, цяпер знаходзіцца за межамі краіны. Літаральна за тыдзень памянялі заяўку. Але і тут усё аказалася не так проста: нашы Вольга Лябецкая, Марыя Васілёнак, якія даўно і арганічна ўпісаліся ў ролі Галінкі і Сцепаніды, па аб'ектыўных прычынах таксама не маглі іграць. Давялося аператыўна, за тыдзень, увесці ў спектакль Вікторыю Урбановіч і Галіну Францкевіч. Было шмат нерваў, сумненняў, няўвязак, нестыковак… Часам то адзін, то другі задаваў пытанне: навошта нам увогуле ехаць? Каб з трэскам праваліцца?

Але як там гаварыў Напалеон? Галоўнае – увязацца ў бой, а потым – паглядзім…

На фестываль было заяўлена 15 пастановак, з якіх дзве прадстаўлялі гродзенскія калектывы, дзве – лідскія. Да паказу журы, якое, да слова, узначальвалі вядомы гродзенскі акцёр і рэжысёр Аляксандр Калагрыў і выкладчык Гродзенскага каледжа мастацтваў Марыя Пятроўская адабрала 8. Тэмы і жанры самыя розныя: драма, камедыя, вадэвіль, батлейка, драматычна-харэаграфічная кампазіцыя...

І мы са сваім «спектаклем на табурэтках»! Да таго ж нам выпала выступаць першымі. З аднаго боку – добра, бо не трэба затым цэлы дзень хвалявацца і перажываць, а з другога – ёсць усе шансы, што ўражанні ад наступных работ (а слабых спектакляў не было, мы пагледзелі амаль усе) пераб'юць эмоцыі ад нашага выступлення, нават калі яны з’явяцца.

Не перабілі! «Калядны вечар» быў названы лепшым спектаклем 13-х «Лідскіх сустрэч»! Дзякуй, Наталия Владимировна Волк-Леонович, Крысціна Гіруць, Алена Гануліч, Галіна Францкевіч, Вікторыя Урбановіч. Мы зрабілі гэта! Дзякуй тым, хто верыў у нас, дапамагаў і падтрымліваў: Вольга Баяровіч, Наталля Тамашэўская. Сняжана Мікша.

Асабіста для мяне гэтая перамога стала прышчэпкай ад шматлікіх унутраных комплексаў у адносінах як да гэтага спектакля, так і да сваёй так званай драматургіі.

Спадзяюся, пасля яе з'явіцца стойкі імунітэт…

**Ніна РЫБІК**

**На фота:** удзельнікі пастаноўкі па п’есе Ніны Рыбік «Калядны вечар» – пераможцы конкурснай праграмы абласнога тэатральнага фестывалю «Лідскія сустрэчы». Ліда, лістапад 2024 года.






Ліда


Віншуем!